**Стандарты відэатэхналогій ствараюць глабальную пляцоўку**

Пасланне да Сусветнага дня стандартызацыі – 2019

Дасягненні ў галіне відэатэхналогій змянілі наш свет, пераўтварылі сферу забаў, аб'ядналі сяброў і сем'і па ўсім свеце, узбагацілі нашы зносіны і дазволілі істотна палепшыць медыцынскае абслугоўванне і адукацыю.

Інавацыі апошніх дзесяцігоддзяў прывялі да вялізнага скачка ў паляпшэнні якасці відэа. Відэатэхналогіі таксама сталі больш даступнымі, дапамагаючы людзям ва ўсім свеце дзяліцца сваімі гісторыямі пры дапамозе яркіх адлюстраванняў. Гэтыя дасягненні сталі магчымымі, дзякуючы міжнародным стандартам.

Распрацаваныя ў выніку супрацоўніцтва IEC, ISO і ITU стандарты ў галіне кадзіравання відэаадлюстраванняў былі ўдастоены двух Прайм-тайм прэмій "Эмі". Гэта з'яўляецца прызнаннем ключавога значэння дадзеных стандартаў у задавальненні попыту, які расце, на відэа як адзін з самых папулярных сэрвісаў, працуючых у глабальных сетках.

Міжнародныя стандарты адпавядаюць сучасным патрабаванням відэаіндустрыі. Яны таксама забяспечваюць плаўны пераход да наступнага пакалення тэхналогій сціскання відэа, дапамагаючы атрымаць максімальную аддачу ад кожнай хвалі інвестыцый.

Прымяненне міжнародных стандартаў азначае, што відэа, закадзіраванае на адным устройстве, можа быць дэкадзіравана на другім, незалежна ад тыпу ўстройства, якое выкарыстоўваецца. Такі падыход забяспечвае пашырэнне рынкаў за кошт эфекту маштабу, што дае інаватарам упэўненасць у інвестыцыях у новыя відэададаткі і паслугі.

**Джэймс ШЭНАН, Прэзідэнт IEC**
**Джон УОЛТАР, Прэзідэнт ISO**
**Хаўлінь ЧЖАО, Генеральны сакратар ITU**

* Прайм-тайм прэмія «Эмі» – галоўная амерыканская прэмія ў галіне тэлебачання, штогод уручаецца Амерыканскай тэлевізійнай акадэміяй. Першая цырымонія ўручэння адбылася ў 1949 г. і першапачаткова называлася проста "Прэмія Эмі" аж да 1972 г., пакуль не была створана «Дзённая прэмія Эмі» і слова «прайм-тайм» было дададзена ў назву.
"Эмі" лічыцца тэлевізійным эквівалентам "Оскара", прэмій "Грэмі" і "Тоні".
IEC, ISO і ITU атрымалі Прайм-тайм прэміі "Эмі" ў 2008 і 2017 гадах за дасягненні ў інжынерна-тэхнічных распрацоўках у галіне відэа: за стандарты кадзіравання відэаадлюстраванняў.